народного музыкального творчества Беларуси. С одной стороны, традиционный фольклор выступает памятником исторического прошлого и, соответственно, – частью этнокультурного и национального наследия. С другой стороны, он «живое», плодотворно функционирующее явленне художественного настоящего.

Одна нз наиболее выразительных таких граней – ассоциативная музыкально-образная и художественно-поэтическая. Именно она все отчетливее выдвигается в настоящее время на первый план, становясь ведущей и определяющей в развитии народной традиционной песенной музыкальной практики. Усиление роли ассоциатовно-художественного начала в творчестве певцов дает новое освещение раннеклассическому наследию, по-новому определяет его назначенне и место в условиях современности. В музыкальном быту современного белорусского села жизнь народной классической песни (в том числе – древнейшей) поддерживается и стимулируется, как веками сложившимся ритмом ее общественного функционирования, так и ее художественно-эстетической активностью. В разряд воссоздаваемых (воспроизводимых) перешли многие из тех трудовых и праздничных ритуально-магических действ, составным компонентом которых является обрядовая песня и наигрыш.

Функциональному «раскрепощению» репертуара песенных образцов из круга строго приуроченных по времени и обстоятельствам исполнения противостоит активное встречное движение: вовлечение в приуроченный сезонно-календарный, семейно-обрядовый, семейно-бытовой репертуар песен иной функциональной природы, относящихся к другим циклам белорусской народной песенности, в том числе – циклам новейшего формирования. Многие из них не регламентированы по времени и обстоятельствам исполнения. Бытуя свободно, они образуют, по певческой терминологии, группу «абы-калі». Будучи включенными в репертуар приуроченных песен, они приводят к жанровому, тематическому и музыкально-стилистическому расширению круга, образов, пополняя и обогащая его. Особо, надо отметить область лирического и лирико-повествовательного фольклора. Причиной тому не только функциональная гибкость песен лирического, а также песен повествовательного склада (например, балладных). Самое главное в стилистической сфере белорусской народно-песенной лиро-эпики и неприуроченной лирики, способность её сближения с разными историко-стилевыми пластами национального музыкального фольклора. О том, насколько такие качества содействуют проникновению лирико-повествовательных и собственно лирических образцов в циклы приуроченных песен, говорит состояние традиционного песенного репертуара современного села, достаточно широко представленная в нем среди «вясенніх», «восеньскіх», «пiлiпаўскiх» и т.п., сфера внеобрядовой лирики. Критерием отбора лирических вариантов, «подходящих» для закрепления, выступают не только общие факторы ассоцаатавно-психологического и торжественно-эстетического плана, но и тонко ощущаемая народными певцами близость музыкально-поэтического строя лирических и лирико-повествовательных образцов, песням приуроченных традиционных жанров. При всей функциональной динамичности раннеклассической песенной системы белорусского фольклора музыкальное ее «ядро» (древние канонические напевы календаря, свадьбы, причитаний и т.п.) остается прнципиально неизманным, а вводимые в репертуар песенные образцы, подчиняются стилистическим закономерностям традиционной мелодики.

Все это свидетельствует о разомкнутости сферы музыкального творчества, опирающегося на современную стилевую традицию, об «открытости» ее навстречу разным интонационным потокам, об активности в принятии нового, идущего как от музыки быта с ее мощной и пестрой интонационной стихией, так и от музыкального окружения, внешнего по отношению к фольклору. При этом музыкальной средой, рожденной вне традиционного фольклорного русла, затрагивается не только новейший пласт народного музыкального творчества. Реально существующая фольклорная ситуация намного сложнее, динамичнее и многоплановее.

По сути, все формы и жанры фольклора, бытующие в условиях современности, испытывают на себе ее художественное воздействие, так или иначе контактируя и с проявлениями фольклоризма, и с массовым любительским творчеством, и с авторской песней.

Среди них, исконную и классическую для фольклора специфику устойчиво сохраняют лишь те области и те проявления современной народной песенной культуры, которые опираются на традиционную музыкальную практику, законы и интонационный опыт.

***Кацярына Чарнова***

## ВАРШТАТЫ ТРАДЫЦЫЙНАГА СПЕВУ Ў СВЯТЛЕ ПЫТАННЯ АХОВЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

Апошнім часам праблема захавання культурнай спадчыны (у тым ліку этнічнай) і яе нематэрыяльных каштоўнасцей паўстае ўсё больш востра. На старонках навуковага друку, прысвечанага культурна-сацыялагічным пытанням, пануе ідэя «экалогіі культуры» (Дзм. Ліхачоў). Праз шырока тыражыраваную думку акадэміка пра тое, што культурны асяродак неабходны для духоўнага, маральнага жыцця чалавека, «для яго культурнай аседласці, для яго прывязанасці да родных мясцін, прытрымлівання запаветам продкаў, для яго самадысцыпліны і сацыяльнасці» сцвярждаецца прынцыповая неабходнасць захавання культурнага асяроддзя для далейшага быцця сучасных грамацтваў, для нармальнага існавання сучаснай цывілізацыі [4]. Па сутнасці магчыма казаць пра фарміраванне асобнага культуралагічнага накірунку – культуролага-экалагічнага, мэтай якога выступае клопат пра захаванне культурнай спадчыны і пераказанні яе наступным пакаленням.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сапраўды, чалавек з'яўляецца часткай прыроды, але ён з'яўляецца і часткай створанай тысячагоддзямі культуры. Апошняя тым больш важна, паколькі «датычыць самой існасці чалавека» [4]. Першаснай і прыярытэтнай часткай культурнай скарбніцы кожнага народа выступае этнічная традыцыя, якая з'яўляецца крыніцай і важнейшым каналам перадачы сацыяльна-культурнага вопыту этнасу.

Традыцыйны спеў – узор нематэрыяльнай культурнай спадчыны народа, які патрабуе ва ўмовах згасання «жывой традыцыі» шырокай актуалізацыі. Пытанні захавання традыцыйнай спеўнай культуры як адной з культурных адметнасцей народа шырока ўзнімаюцца спецыялістамі культуралагічнай сферы[77] [2, 3, 5, 7-9]. Шлях падтрымання духоўнай музычнай спадчыны бачыцца ў яе папулярызацыі на ўсіх узроўнях і ўсімі даступнымі сродкамі.

Адной з папулярных сёння форм актуалізацыі традыцыйных каштоўнасцей з'яўляюцца варштаты[78], якія праводзяцца ў розных сферах культурнай, творчай дзейнасці чалавека – варштаты тэатральныя, музычныя, літаратурныя, харэаграфічныя і г.д. У сферы музычнай традыцыйнай культуры варштаты (прысвечаныя песенным і інструментальным формам), якія ўяўляюць сабой узор мастацка-практычнай фалькларыстыкі, дастаткова распаўсюджаны і з'яўляюцца адной з форм актуалізацыі этнічнай культурнай спадчыны[79]. Звернемся да вопыту правядзення вартштатаў традыцыйнага мастацтва (у прыватнасці традыцыйнага спеву) у бліжэйшых краінах-суседзях.

Майстар-класы і практычныя семінары, прысвечаныя рабоце вучэбных і творчых калектываў з аўтэнтычным фальклорам і засваенню прынцыпаў традыцыйнага музіцыравання, рэгулярна праводзяцца ў шматлікіх гарадах Расіі. Накіраваныя на папулярызацыю фальклорнай музычнай спадчыны, павышэнне цікаўнасці да вытокаў нацыянальнай музычнай культурны, яны стымулююць інтарэс да вывучэння і засваення абразцоў народнай традыцыйнай культуры. Вялікія намаганні ў гэтай сферы прыкладаюць супрацоўнікі Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі па вывучэнню традыцыйных музычных культур РАМ ім. Гнесіных (Масква).

У Паланге (Літва) пачынаючы з 2000 года традыцыйна (штогод) праводзіцца Міжнародная летняя творчая школа «Традыцыя», ініцыятарам і арганізатарам якой выступае Цэнтр фальклору і этнаграфіі нацыянальных абшчын Літвы, Школа славянскай традыцыйнай музыкі, Вільнюскі цэнтр рускага фальклору. У межах фестывалю праводзяцца не толькі канцэрты фальклорных калектываў, круглы стол па праблемах захавання народных традыцый, але і «творчыя лабараторыі» вядучых фалькларыстаў. З 2003 года ў Віграх (Сувалкія) падчас Міжнароднай канферэнцыі «Агульныя праблемы традыцыйнага спеву» праводзяцца заняткі па засваенню этнапесеннай традыцыі. Да ўдзелу ў такіх варштатах запрашаюцца кіраўнікі і ўдзельнікі фальклорных ансамблей, выкладчыкі музычных школ і школ мастацтваў, дамоў творчасці, усе зацікаўленыя ў павышэнні ўзроўню выканальніцкай культуры і ўдасканалення методыкі работы з фальклорным калектывам.

У Польшчы арганізацыя такіх майстар-класаў з'яўляецца вельмі распаўсюджанай і фактычна нарматыўнай падчас правядзення разнастайных этнамузыказнаўчых форумаў. Напрыклад, экспрэс-курсы па засваенні традыцыйнага спеву з 2000 года існуюць у межах Міжнароднай школы традыцыйнай культуры, якую праводзіць польскі фонд «Fundacja Muzyka Kresow» (Люблін).

Асобую ролю ў захаванні, актуалізацыі традыцыйнага польскага спеву адыгрывае Навуковае Кола Этнамузыкалогіі Варшаўскага ўніверсітэта (Koło Naukowe Etnomuzykologii), якое разгарнула сваю дзейнасць у 2003 годзе Навуковым апекуном з'яўляецца доктар навук, прафесар Інстытута музыкалогіі Варшаўскага ўніверсітэта П.Даліг. Сферы дзейнасці Кола Этнамузыкалогіі дастаткова разнастайныя. Сярод форм культурна-асветніцкай накіраванасці вылучаюцца варштаты традыцыйнага спеву.

Правядзенне варштатаў традыцыйнага спеву арганізавана Колам Навуковым Этнамузыкалогіі з мэтай азнаямлення моладзі (у першую чаргу студэнтаў Варшаўскага ўніверсітэта) з музыкай вёскі, яе далучэння да скарбніцы нацыянальнай культуры. Як патлумачыла адна з арганізатараў варштатаў Вольга Козел (студэнтка V курса Інстытута музыкалогіі Варшаўскага ўніверсітэта) моладзь, на вялікі жаль, часам недаацэньвае каштоўнасць традыцыйнага спеву. Назіраецца стаўленне да этнапесеннай традыцыі (рэпертуару, стылю і манеры выканання вясковых спевакоў) як да спеву вельмі простага (нават спрошчанага), у той час як на сам рэч традыцыйны спеў з'яўляецца надзвычай тонкім, складаным, «жывым» і зменлівым арганізмам. Сустракаюцца такія меркаванні і сярод студэнтаў-музыколагаў, якія займаюцца даследаваннем музыкі «высокай традыцыі».

Рэпертуар для заняткаў абіраецца не толькі з імкнення да «разнастайнасці» (з жадання як мага шырэй пазнаёміць з багаццем этнапесеннай традыцыі ва ўсёй яе разнастайнасці, суквеццем рэгіянальных музычных

---

[77] Неабходнасць захавання традыцыйнай культуры сцвярджаецца і ў адукацыйнай сферы, у якой, па сутнасці, сфарміравана асобная галіна – этнапедагогіка. У яе межах фальклор разглядаецца як важнейшы кампанент культуры, а выхаванне шляхам навучання традыцыйным відам мастацтва асэнсоўваецца як дзейсны сродак далучэння да арыгінальнай культуры этнасу [1, 6].

[78] Варштат – адно з найбольш распаўсюджаных азначэнняў спецыфічнай формы заняткаў/выкладаў, у якіх настаўнік (майстар) паказвае ход работы, а потым выконвае яе адначасова з вучнямі (слухачамі, аудыторыяй), пры гэтым кантралюе правільнасць выканання, падказвае і выпраўляе работу аудыторыі. Сінанімічнымі выступаюць паняцці масцер-клас, трэнінг. Азначэнне «варштат» найбольш часта выкарыстоўваецца ў дачыненні да творчай дзейнасці чалавека.

[79] На Беларусі такія практыкі покуль адзінкавыя, хоць практычнае засваенне этнафоніі магутна разгорнута ў межах вучэбнага працэсу на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў: з 2004 года спецыялізацыя "Этнафоназнаўства" рыхтуе спецыялістаў-практыкаў у галіне беларускай музыкі вуснай традыцыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыялектаў), але і з уласных прыхільнасцей і меркаванняў настаўніка. Напрыклад, узгаданая вышэй Вольга Козел (а менавіта яна праводзіць варштаты апошнім часам) аддае перавагу песеннаму рэпертуары з Любельшчызны. Першай нагодай, якой абумоўлены такі выбар, з'яўляецца асабістае стаўленне да песен гэтага рэгіёна. Другой выступае ўпэўненнасць у тым, што песні менавіта з гэтых тэрыторый найбольш прыдатны для працы ўласна вакальнай – яны дастаткова складаныя, паколькі вельмі важную ролю ў іх адыгрывае фактар артыкуляцыі: праца над імі вымагае (а значыць і ўстанаўляе) добра пастаўленага маўленча-спеўнага апарату.

Формы і метады засваення спеўнай этнафанічнай традыцыі падчас варштатаў Кола Этнамузыкалогіі сумяшчаюць асноўныя прынцыпы этнапедагогікі (вуснае перайманне, уключанае назіранне) і вакальнай педагогікі (вакальна-дыхальны трэнінг, праслухоўванне і аналіз узору на ўзроўні інтанацыйна-рытмічнага малюнка, тэхналагічнае засваенне матэрыялу). Агульная будова занятка-трэнінга ўлучае некалькі раздзелаў і выглядае наступным чынам: рухальная размінка, дыхальныя практыкаванні, настройка моўнага апарату, распеўка (пабудавана як на «класічных» вакальных узорах, так і на папеўках, уласцівых традыцыйнаму спеву з асаблівасцямі рэгіянальных спеўных дыялектаў і спосабаў гуказдабывання), непасрэднае развучванне песеннага матэрыялу.

Безумоўна, варштаты традыцыйнага спеву з'яўляюцца адной з перспектыўных форм актуалізацыі і папулярызацыі музычнай культуры вуснай традыцыі. У межах ідэі «экалогіі культуры» яны выступаюць магутным актам захавання помнікаў культуры, нематэрыяльных каштоўнасцяў этнічнай духоўнай спадчыны. Але варта задаць пытанне: ці можна лічыць такія акцыі сродкам пераемнасці традыцый? Заўважым, што пры ўсёй важнасці і неабходнасці яны ўяўляюць сабой эстэтычна-мастацкае пераасэнсаванне традыцыі.

**Спіс літаратуры:**


1. Власова, С. Этнокультурный компонент в современном школьном образовании / С. Власова // Фольклор и молодежь: приобщение детей и молодежи к традициям национальной культуры : сб. науч. ст. / сост. С.Р. Кулева. – Вологда, 2011. – С.71–85.
2. Игнатович, П. Сохранение фольклора – веление времени / П. Игнатович // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. V Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 красав. – 1 мая 2011 г. / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 31–33.
3. Кавалёва, Р. Фальклор і час: да праблемы падтрымання духоўнай спадчыны беларускага народа / Р. Кавалёва // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. IV Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 красав. 2010 г. / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 26–29.
4. Лихачев, Д. Экология культуры / Д. Лихачев // Национальная энциклопедическая служба [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://terme.ru/dictionary/706/word/yekologija-kultury. – Дата доступа: 04.02.2015.
5. Пладунова, Т. Актуалізацыя этнафанічных традыцый каляндарна-абрадавага цыкла ў сучаснай культурнай прасторы / Т. Пладунова // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. / навук. рэд. Р.М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск : РІВШ, 2010. – Вып. 7. – С. 50–55.
6. Пладунова, Т. Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы / Т. Пладунова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. IV Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 красав. 2010 г. / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С.126–129.
7. Пладунова, Т. Фальклор як экасістэма культуры / Т. Пладунова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. VII Міжнар. навук. канф., Мінск, 26–28 красав. 2013 г. / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С.185–187.
8. Сівурава, Л. Этнакультурныя каштоўнасці: механізм замацавання і актуалізацыі / Л. Сівурава // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. V Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 красав. – 1 мая 2011 г. / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 33–35.
9. Снежко, В. Экологическая культура как неотъемлемая составляющая процесса единения человека и природы / В. Снежко // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. IV Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 красав. 2010 г. / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 35–36.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Генадзь Лапацін***

## «ПЕСНІ – ГУ́РТАМ... ПРЫПЕЎКУ – АДНА ПЯЕШ…»

Гэты артыкул напісаны паводле размоў з Варварай Аляксандраўнай Грэцкай [1]. З 2005 па 2015 гг. ад яе запісана каля 90 аўдыёкасет. У яе памяці захаваны ўвесь фальклорна-этнаграфічны рэпертуар в. Амяльное Веткаўскага раёна. Гэта песні каляндарнага і сямейна-побытавага цыклаў, лірычныя, дзіцячыя, сірочыя песні, замовы і апісанні абрадаў і звычаяў, легенды, прыкметы, павер'і. Практычна, гэта – карціна Сусвету беларусаў ва ўяўленнях адной асобы [2]. З усяго расказанага сп. Варварай і запісанага мной ад яе, прыпеўкі (яна і сама іх называе «прыпеўкамі») займаюць месца не самае істотнае. Але, гэта – не таму, што яна іх не ведае. Ведае яна іх больш, чым дастаткова. «По етаму ўжо *частушкі*, а калісь *прыпеўкі* звалі, па-старыннаму. А ціпер ужо – *частушкі* гаворяць. А ета адзін чорт, што *прыпеўкі*, што *частушкі*». [Хто на Амяльным знаў прыпевак больш за